# Апісанне ўрока

Пры вывучэнні тэмы “Паўстанне 1863 – 1864 г. К. Каліноўскі” мэтазгодна правесці інтэграваны ўрок па гісторыі Беларусі і беларускай літаратуры. Яго змест – рэвалюцыйна-дэмакратычная і публіцыстычная дзейнасць К. Каліноўскага, характарыстыка плыняў у нацыянальна-вызваленчым руху ў Польшчы, Беларусі і Літве, прычыны, ход і вынікі паўстання 1863 – 1864 гг. Гэта трэці ўрок ў раздзеле II «Зацвярджэнне капіталізма на беларускіх землях: другая палова XIX – пачатак XX ст.», 9 клас.

На ўроку вучні выконваюць розныя заданні, работаюць з матэрыяламі падручнікаў, аналізуюць схемы, складаюць табліцы, выступаюць з паведамленнямі.

У ходзе ўрока выкарыстоўваюцца франтальная, групавая і індывідуальная праца. Прымяняюцца розныя метады навучання: рэпрадуктыўны, тлумачальна-ілюстрацыйны, даследчы, праблемна-паведамляльны, часткова-пошукавы.

Для дасягнення пастаўленай мэты ўжываюцца элементы інфармацыйна-камунікатыўнай тэхналогіі, крытычнага мыслення. Мультымедыйная прэзентацыя спрыяе ўспрыманню матэрыяла і павышэнню матывацыі да вывучэння гісторыі.

Для забеспячэння рэлаксацыі на ўроку праводзіцца фізкультхвілінка.

| Этап урока | Апісанне этапаў урока |
|---|---|
| Мэта ўрока | сфарміраваць у вучняў цэласнае ўяўленне аб жыцці, поглядах, літаратурнай і рэвалюцыйнай дзейнасці выдатнага беларускага рэвалюцыянера-дэмакрата і публіцыста К. Каліноўскага (слайд 2). |
| Задачы ўрока | - раскрыць прычыны, ход і вынікі паўстання 1863-1864 гг. праз характарыстыку палітычных поглядаў і рэвалюцыйна-вызваленчай дзейнасці К. Каліноўскага; |

| | |
|---|---|
| | - развіццё навыкаў характарыстыкі паўстанняў і гістарычных дзеячаў, работы з гістарычнымі крыніцамі, пабудовы храналагічных і аналітычных табліц.<br>- выхаванне пачуцця нацыянальнай годнасці, пашаны да сваёй Радзімы, павагі да нацыянальных герояў Бацькаўшчыны. |
| Тып урока | Атрыманне новых ведаў з выкарыстаннем элементаў інфармацыйна – камунікатыўнай і тэхналогіі крытычнага мыслення. |
| Афармленне дошкі | На дошцы запісаны эпіграф урока. Партрэт К. Каліноўскага і гады яго жыцця. Ілюстрацыі пра жыццё і дзейнасць. |
| I. Арганізацыйна – матывацыйны этап | Прывітанне. Падрыхтоўка вучняў да урока. Для таго, каб наладзіць навучэнцаў на ўспрыманне вучэбнага матэрыялу праводзіцца матывацыйная гутарка, дзе настаўнікі знаёмяць з задачамі і планам ўрока. Для ўзмацнення эмацыянальнай афарбоўкі слоў выкарыстоўваюцца чатырохрадкоўі Я. Купалы і М. Лужаніна. Вывучэнне новага матэрыяла праводзіцца ў адпаведнасці з планам (слайд 3):<br>1. Прычыны і характар паўстання<br>2. Удзельнікі паўстання і іх патрабаванні<br>3. К. Каліноўскі. “Мужыцкая праўда”<br>4. Ход і вынікі паўстання<br>5. “Пісьма з-пад шыбеніцы”<br>6. “Марыська чарнаброва – галубка мая” |
| II. Аператыўна – пазнавальны этап | Для таго, каб пазнаеміць вучняў з біяграфічнымі сведкамі пра К. Каліноўскага вучань атрымаў |

| | |
|---|---|
| | апераджальнае заданне - падрыхтаваць паведамленне пра маленства і юнацтва К. Каліноўскага (дадтак 1).<br>Далей настаўнік гісторыі вызначае передумовы і прычыны паўстання, абапірыючыся на дамашні матэрыял (вучні адказваюць на пытанні па дамашняму заданню).<br>На наступным этапе клас дзеліцца на дзве групы і выконвае заданні па аналізу табліц і схем. Абменьваюцца атрыманай інфармацыяй.<br>Далей вучні слухаюць настаўніка літаратуры. Па хрыстаматыі чытаюць другі нумар “Мужыцкай праўды” і праводзяць яго аналіз па пытаннях.<br>На падставе раней вызначаных прычын і перадумоў паўстання, на дошцы, школьнікі разам з настаўнікам гісторыі складаюць храналагічную табліцу “Ход паўстання 1863 – 1864 гг.” і высвятляюць прычыны яго паражэння (чытаюць пункт 4 § 15, спыняюцца на датах, заносяць іх у табліцу). Калі ў тэксце з’яўляецца асоба М. Мураўёва спыняюцца і пераключаюсь сваю ўвагу на слайды прэзентацыі. Адзін з вучняў зачытвае аб яго дзейнасці на т. Беларусі. Запаўняюць далей табліцу і вылучаюць прычыны падаўлення паўстання.<br>Настаўнік літаратуры прыводзіць параўнанее даты смерці К. Каліноўскага з прыроднай з’явай – вясновым сонцазваротам. Чытае верш “Пісьмо з-пад шыбеніцы”, а вучні аналізуюць яго. Асаблівая ўвага звяртаецца на ўзрост К. Каліноўскага “Усяго 26. А зроблена так многа… І ўжо аддадзена жыццё за светлае заўтра народа”.<br>На апошнім этапе гэтай часткі ўрока, дзяўчынка, ў вобразе Марыі Ямант, апавядае пра іх каханне і чытае на |

| | |
|---|---|
| | памяць верш “Марыська чарнаброва – галубка мая” (дадатак 2).<br>Вучні пісьмова выконваюць заданні (адказваюць на 10 пытанняў), потым абменьваюцца з суседам па парце, для праверкі. На адваротным баку дошкі запісаны правільныя адказы. |
| ІІІ. Карэкцыйна - рэфлексіўны этап | Праводзіцца выніковая рэфлексія вучнеўскай і настаўніцкай працы на ўроку. Ацэньваюцца дасягненні вучняў. Настаўнікі інфармуюць аб хатнім заданні. |

План – канспект інтаграванага ўрока па гісторыі Беларусі і беларускай літаратуры

Тэма ўрока: Паўстанне 1863 – 1864 гг. К. Каліноўскі. Газета “Мужыцкая праўда. Верш “Марыська Чарнаброва, галубка мая”

Мэта ўрока: сфарміраваць у вучняў цэласнае ўяўленне аб жыцці, поглядах, літаратурнай і рэвалюцыйнай дзейнасці выдатнага беларускага рэвалюцыянера-дэмакрата і публіцыста К. Каліноўскага (слайд 2).

Задачы ўрока: - раскрыць прычыны, ход і вынікі паўстання 1863-1864 гг. праз характарыстыку палітычных поглядаў і рэвалюцыйна-вызваленчай дзейнасці К. Каліноўскага;

- развіццё навыкаў характарыстыкі паўстанняў і гістарычных дзеячаў, работы з гістарычнымі крыніцамі, пабудовы храналагічных і аналітычных табліц.

- выхаванне пачуцця нацыянальнай годнасці, пашаны да сваёй Радзімы, павагі да нацыянальных герояў Бацькаўшчыны.

Эпіграф:

Яго імя мы помнім у нягодах
І ў час шчаслівай, бы вясна, пары.
А нашы сэрцы, поўныя свободай,
Гарэць, як Каліноўскага кастры.

С. Законнікаў.

Ход урока:

I. Арганізацыйны момант

II. Вывучэнне новага матэрыяла, абапіраючыся на дамашняе заданне.

*Настаўнік гісторыі*: Нямала выдатных людзей есць у гісторыі кожнага народа. Есць яны і ў беларусаў. Сярод іх – выдатны рэвалюцыянер – дэмакрат, мысліцель, паэт, публіцыст, таленавіты кіраўнік паўстання 1863-1864 гадоў на Беларусі і ў Літве К. Каліноўскі.

Я адплаціў народу,
Чым моц мая магла:

Зваў з путаў на свободу,

Зваў з цемры да святла.

Гэтыя словы належаць народнаму паэту Беларусі Янку Купалу. Але іх з поўным правам можна аднесці і да Кастуся Каліноўскага. Таму наша сенняшняя задача – атрымаць цэласнае ўяўленне аб яго жыцці, поглядах, літаратурнай і рэвалюцыйнай дзейнасці (слайд 3).

*Настаўнік літаратуры:* Угледзімся ўважліва ў гэтае аблічча… высокі сакратаўскі лоб, бровы ўразлёт выдаюць бясстрашнасць і непадкупнасць, глыбокія, не па гадах мудрыя вочы, прамы прыгожы нос – аблічча чалавека моцнага, валявога. І пагляд… прасветлены, чысты, удалечыню…

Чыста мару марыўшы
Свой кароткі век,
Жыў ды быў, таварышы,
Светлы чалавек…
Рваў ён змроку прадзіва,
Цэлы свет любіў,
А быў нашым прадзедам,
Беларусам быў.
Мары сцяг нявытканы
Ён сплаціў жыццём.
Знаўся з белай світкаю,
Зваўся Кастусём.
З шыбеніцы дзёрзка ён
Б’е ў грымотны звон…
Чуеш Каліноўскага?
Пакладзі паклон.

М. Лужанін. Светлы чалавек.

Выступ вучня з паведамленнем аб жыцці і дзейнасці К. Каліноўскага (слайд 4 – 5) (*дадатак 1*).

*Настаўнік гісторыі:* А зараз давайце звернамся з вамі да дамашняга задання і ахарактарызуем умовы жыцця сялян і рабочых пасля адмены прыгоннага права.

- Ахарактарызуйце ўмовы жыцця сялянскай беднаты і рабочых ў другой палове XIX ст.
- Растлумачце, чаму сяляне вымушаны былі прадаваць свой ураджай адразу пасля яго ўборкі – у сезон нізкіх цэн.
- Прывядзіце прыклады сялянскай барацьбы ў другой палове XIX ст.
- Растлумачце, чаму сяляне з Беларусі імкнуліся перасяліцца на свободныя землі ў Сібір.

1. Прычыны і характар паўстання

*Настаўнік гісторыі:* Пачатак 1863 г. азнаменаваўся новым уздымам сялянскага руху на Беларусі, які быў выкліканы надзеямі сялян атрымаць сапраўдную волю ў сувязі з пераводам іх у становішча часоваабавязаных. Гэта супала па часу з нацыянальна-вызваленчым паўстаннем, якое ахапіла ў 1863 г. усю Польшчу.

2. “Чырвоныя” і “белыя” (слайд 6 – 7)

Вучні працуюць у групах

Заданне групе 1:

разглядзець табліцу і даць характарыстыку мэтам і сродкам барацьбы “белых” і “чырвоных”

| | “Белыя” | “Чырвоныя” | |
|---|---|---|---|
| | | Правыя | Левыя |

| | | | |
|---|---|---|---|
| мэты | Аднаўленне Польшчы ў межах 1772 г. | Рашэнне аграрнага пытання | Рашэнне аграрнага пытання. Самавызначэнне Беларусі, Літвы і Украіны |
| сродкі | З дапамогай Англіі і Францыі | З дапамогай і пад кіраўніцтвам шляхты | У саюзе з рэвалюцыйнымі сіламі Расіі |

Заданне групе 2:

разгледзець схему і ахарактарызаваць сацыяльны склад “белых” і “чырвоных”



| | | |
|---|---|---|
| | шляхта, інтэлігенцыя | часткова сялянства |

*Настаўнік гісторыі:* Для падрыхтоўкі паўстання вясной 1862 г. у Варшаве быў створаны Цэнтральны нацыянальны камітэт (ЦНК). Летам 1862 г. з мэтай падрыхтоўкі паўстання ў Беларусі і Літве ў Вільне быў арганізаваны Літоўскі правінцыяльны камітэт (ЛПК). Старшынёй ЛПК з кастрычніка 1862 г. быў Кастусь Каліноўскі.

3. "Мужыцкая праўда" (слайд 8-9).

*Настаўнік літаратуры:* Прыехаўшы ў родны край, Каліноўскі пачынае знаёміцца з настроямі і жаданнямі народа: ходзіць па беларускіх вёсках і, агітуючы за паўстанне, адначасова прыглядаецца і прыслухоўваецца да таго, чым жывуць людзі

І ў гэты ж час Кастусь Каліноўскі пачынае выданне нелегальнай газеты "Мужыцкая праўда", якая заклікала беларускі народ да ўзброенай барацьбы супраць самадзяржаўя. Друкавалася газета ў выглядзе лістовак на беларускай мове лацінскім шрыфтам. На працягу 1862-1863 гадоў выйшла 7 нумароў газеты. Большасць матэрыялаў газеты напісаў сам К. Каліноўскі пад псеўданімам "Яська-гаспадар з-пад Вільні".

Вучні чытаюць і аналізуюць тэкст лістоўкі "Мужыцкая праўда"

Пытанні:

1.У якім стылі напісана "Мужыцкая праўда"?

2. Дайце характарыстыку гэтаму стылю. Дзе ўжываецца, з якой мэтай, асноўныя адзнакі мовы.

3. З якіх кампазіцыйных частак складаецца тэкст?

4.Да каго звяртаецца Кастусь Каліноўскі?

5. Чаму "дзецюкі"? Падбярыце сінонім.

6. Якую праблему падымае Каліноўскі ў 2 нумары "Мужыцкай праўды" ?

7. Якой Кастусь Каліноўскі паказвае рэальнасць?

8. Чаму так адбываецца?

9. Хто, на думку Кастуся Каліноўскага, з’яўляецца асноўным ворагам народа?

10. Чаму простаму люду баяцца даць волю?

11. Чым заканчваецца “Мужыцкая праўда” № 2?

12. Якія моўныя сродкі выкарыстоўвае Каліноўскі?

13. Чаму “Мужыцкая праўда” друкавалася на беларускай мове лацінскім шрыфтам?

14. Дайце характарыстыку Каліноўскага як публіцыста.

15. Якое значэнне мела публіцыстыка Каліноўскага ў падрыхтоўцы паўстання?

4. Пачатак і ход паўстання, яго падаўленне (слайд 10 – 13)

На падставе раней вызначаных прычын і перадумоў паўстання на дошцы школьнікі разам з настаўнікам гісторыі складаюць храналагічную табліцу “Ход паўстання 1863 – 1864 гг.” і высвятляюць прычыны яго паражэння.

**Ход паўстання 1863–1864 гг.**

| Дата | Асноўныя падзеі |
|---|---|
| 10(22) студзеня 1863 г. | Пачатак паўстання ў Польшчы. Выдача польскім нацыянальным урадам Маніфеста і двух зямельных дэкрэтаў |
| 20 студзеня (1 лютага) | Літоўскі правінцыяльны камітэт падтрымлівае паўстанне, рэарганізуецца ў Часовы ўрад Літвы і Беларусі і выдае Маніфест |
| 27 лютага (11 сакавіка) | «Белыя» адхілілі Часовы ўрад Літвы і Беларусі на чале з К. Каліноўскім ад кіраўніцтва паўстаннем і ўтварылі замест яго Аддзел кіраўніцтва правінцыямі Літвы |
| Вясна 1863 г. | Найвышэйшы ўздым паўстання на тэрыторыі Беларусі |
| Красавік | Захоп паўстанцамі г. Горкі |
| Май | Бітва каля в. Мілавіды Слонімскага павета |
| Канец ліпеня | К. Каліноўскі зноў запрошаны ў Вільню і ўзначаліў Аддзел кіраўніцтва правінцыямі Літвы |
| Пачатак верасня | Паўстанне падаўлена ў Літве і Беларусі |
| Студзень 1864 г. | У Вільні арыштаваны К. Каліноўскі |
| 10(22) сакавіка | Пакаранне смерцю К. Каліноўскага |

Асноўнымі прычынамі паражэння паўстання сталі:

- разыходжанні ў поглядах ўдзельнікаў паўстання;

- адсутнасць адзінага плана баявых дзеянняў;
- недахоп сіл і зброі;
- вызкая сацыяльная база (сяляне ў большасці не падтрымалі паўстанне, а часта і выступалі супраць шляхты);
- аб'яўленне беларуска-літоўскіх губерняў на ваенным становішчы і правядзенне карнай аперацыі супраць паўстанцаў пад кіраўніцтвам віленскага генерал-губернатара М. Мураўёва.

5. "Пісьма з-пад шыбеніцы" (слайд 14, 15)

*Настаўнік літаратуры:* 22 сакавіка. Вясновы сонцазварот. Святло нарэшце перамагае цемру пасля доўгай і суровай зімы. Святло ў прыродзе і ва ўсім свеце, святло ў душах і ўчынках людзей. А яго вядуць на эшафот. Дзесять гадзін раніцы. Кастусь Каліноўскі на Лукішскай плошчы.

Браты мае, родныя мужыкі. З-пад шыбеніцы маскоўскай прыходзіцца мне да вас пісаць, і, можа, раз астатні. Горка пакінуць зямельку родную і цябе, дарагі мой народзе! Грудзі застогнуць, забаліць сэрца, не жаль загінуць за тваю праўду…

…Бывай здаровы, мужыцкі народзе!
Жыві ў шчасці, жыві ў свабодзе.
І часам спамяні пра Яську свайго,
Што загінуў за праўду для дабра твайго.
А калі слова пяройдзе ў дзела,
Тагды за праўду станавіся смела,
Бо адно з праўдай у грамадзе згодна
Дажджэш, народзе, старасці свабодна.

ПЫТАННІ:

1. Якія пачуцці ўзнікаюць у вас пры чытанні гэтага ўрывачка?
2. Скажыце, Кастусь Каліноўскі перад тварам смерці здрадзіў той жаданай мэце ці не? Дакажыце.
3. У якой форме напісаны гэты ліст?

4. Да чаго заклікае Кастусь Каліноўскі?

5. Развітваючыся з мужыкамі , чаго жадае Кастусь Каліноўскі?

*Настаунік літаратуры:* Калі прагучала яго імя – дваранін Вікенцій Кільноўскі, ён ускрыкнуў: “У нас няма дваран, усе роўныя!”. Кат выбіў табурэтку з-пад ног… Яму было дваццаць шэсць гадоў. Усяго 26. А зроблена так многа… І ўжо аддадзена жыццё за светлае заўтра народа.

6. “Марыська чарнаброва – галубка мая”

Дзяўчынка ў вобразе Марыі Ямант апавядае пра іх каханне і чытае на памяць верш “Марыська чарнаброва – галубка мая” *(дадатак 2).*

ІІІ. Замацаванне вывучанага на ўроку:

Вучні пісьмова выконваюць заданні, потым абменьваюцца для самаправеркі

Пытанні:

1. Дзе нарадзіўся К. Каліноўскі?

2. У якой навучальнай установе Каліноўскі атрымаў адукацыю?

3. Які факультэт Пецярбургскага ўніверсітэта закончыў Каліноўскі?

4. У якім годзе Каліноўскі распачаў стварэнне на Гродзеншчыне рэвалюцыйнай арганізацыі?

5. Назавіце паплечнікаў К. Каліноўскага.

6. Напрамак вызваленчага руху, які ўзначаліў К. Каліноўскі у адрозненні ад “белых” (лібералаў), атрымаў назву … .

7. Які камітэт узначальваў К. Каліноўскі падчас паўстання?

8. Якую назву мела першая рэвалюцыйна-дэмакратычная газета ў Беларусі, якая выдавалася на беларускай мове?

9. Кастусь Каліноўскі быў арыштаваны царскім урадам і публічна павешаны на гандлёвай плошчы Лукішкі ў Вільні. Калі адбылося пакаранне?

10. Як падпісваў К. Каліноўскі “Лісты з-пад шыбеніцы”?

IV. Дамашняе заданне

V. Выстаўленне адзнак за ўрок

VI. Рэфлексія

Дадатак 1

Кароткія біяграфічныя звесткі аб К. Каліноўскім

Шмат слынных сыноў у нашай Беларусі. Усе яны – ваяры і паэты, рэвалюцыянеры і асветнікі – верна і самааддана служылі сваёй маці-Радзіме. Сярод іх – Кастусь Каліноўскі, рэвалюцыянер-дэмакрат, мысляр, паэт, публіцыст, кіраўнік паўстання 1863-1864 гг. на Беларусі і ў Літве. Сёння маё слова пра яго.

Нарадзіўся Кастусь Каліноўскі 2 лютага 1838 года ў маленькай вёсачцы Мастаўляны Гродзенскага павета (цяпер гэта тэрыторыя Польшчы). У метрычнай кнізе мясцовага касцёла яго, сына Сымона Каліноўскага і Веранікі Каліноўскай (з Рыбінскіх), спачатку запісалі Вінцэнтам. Пазней дадалося імя Канстанцін. (Ён стане называць сябе Кастусь, як клікалі сялянскіх сыноў).

Простае, мілагучнае імя. У старажытных рымлян яно азначала “непахісны”, “трывалы”, “цвёрды”.

Дружная, вялікая сям’я (аж 13 дзяцей было ў бацькі) пазней пераязджае ў в. Якушоўка на Гродзеншчыне, амаль на голае месца. Праз нейкі час агульнымі намаганнямі сядзібу ўладкавалі і пачалі жыць хоць не зможна, але ў згодзе.

Вучыўся Кастусь у Свіслацкай гімназіі, дзе існавалі тайныя таварыствы, жыло вальнадумства. Там вучыліся вядомыя дзеячы беларускай, рускай і польскай культур, шмат хто з іх абраў рэвалюцыйны шлях (змаганне з царызмам). Да рэвалюцыйнай дзейнасці далучыўся ў час вучобы на юрыдычным факультэце Пецярбургскага універсітэта.

Вялікую ролю ў арганізацыі паўстання адыгралі яго паплечнікі В.Урублеўскі і Ф. Ражанскі.

<u>Дадатак 2</u>

Марыя Ямант

Я была нявестай Каліноўскага. Гэта мне ён пісаў: “Марыська чарнаброва, галубка мая…”. Мы кахалі адно аднаго, моцна, шчыра кахалі…

Нарадзілася я ў Вільні ў шляхецкай сям’і ў 1843 годзе. Атрымала добрае выхаванне, закончыла прыватны пансіён, вывучала замежныя мовы, гісторыю, літаратуру. Сям’я наша была прагрэсіўных поглядаў, адразу падтрымала нацыянальна-вызваленчы рух.

З кастусём я пазнаёмілася ў нас дома. Мой старэйшы брат Юзаф сябраваў з ім яшчэ з Пецярбурга і аднойчы прывёў да нас. Мы спадабаліся адно аднаму неяк адразу, доўга гаварылі. Аказалася, нашы погляды ў многім

сыходзяцца. Мне прыемна было бачыць яго апантанасць, самаадданасць, шчырасць.

Праз нейкі час я стала яго нявестай.

Калі Кастуся арыштавалі, ён, як мог, адводзіў небяспеку ад нашай сям'і. На допыце нават не прызнаўся, што знаёмы з намі. Аднак нашу сям'ю таксама арыштавалі. Мы больш не сустрэліся. Хоць праз акно камеры маглі бачыць месца зняволення адно аднаго. Праз маю цётку Ядвігу Макрыцкую, якая дамаглася наведванняў да мяне і Кастуся, мы абменьваліся лістамі. Аднойчы ён прыслаў мне верш:

*Марыська чарнаброва, галубка мая,*

*Дзе ж падзелася шчасце і ясна доля Твая?*

*Усё прайшло, прайшло, як бы не бывала,*

*Адна страшэнна горыч у грудзях застала…*

*…Не наракай, Марыся, на сваю бяздолю.*

*Но прымі цяжкую кару, Прадвечнага волю.*

*І калі мяне ўспомніш, шчыра памаліся,*

*То я з таго свету Табе адзавуся…*

Летам 1864 года ўсю нашу сям'ю выслалі ў Сібір. Мяне і сястру Алену – у Табольск. Усе 10 гадоў ссылкі я помніла Кастуся. Замуж не выходзіла, хоць прапановы былі. На Радзіму вярнулася ў 1874 годзе, пазней пасялілася ў Варшаве. Неўзабаве памерлі Алена і яе муж Антоній Віскоўскі, а потым і мой тата. Толькі тады я дала згоду на шлюб з Войцахам Дмахоўскім, але сэрца маё ўсё жыццё належала толькі яму, Кастусю…